**Даследчая работа**
**“Трабы - своеасаблівы край Іўеўшчыны”**

Аўтар: Валканоўская Ангеліна,
вучаніца 11 класа
Кіраўнік: Грышукевіч Мікалай
Аляксандравіч, настаўнік гісторыі
і грамадазнаўства

## УВОДЗІНЫ

Вёска Трабы прыгожая для мяне ў любую пару года. Я вельмі яе люблю. Тут я нарадзілася, тут з’явіліся першыя сапраўдныя сябры, тут мая хата, дзе заўсёды будзе мяне чакаць мая матуля і тата. У вёсцы жывуць старанныя, працавітыя людзі, якія кожным сваім днём ствараюць прыгажосць, хараство, дабрабыт сваёй роднай вёскі. Трабы цяпер уваходзяць у склад Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці. А Іўеўскаму раёну 15 студзеня 2020 года споўнілася 80 год з дня ўтварэння. Для мяне гэта вялікі адрэзак часу, а для гісторыі – імгненне. Вось мне стала цікава, а калі Трабы ўвайшлі ў Іўеўскі раён, як тады працавалі розныя арганізацыі, што змянілася за гэты адрэзак часу і яшчэ шмат пытанняў, якія мяне хвалявалі. Вырашыла больш дэталёва даведацца пра жыццё маёй вёскі ў гэты перыяд. Як толькі пачала цікавіцца тэмай, адразу даведалася, што 20 студзеня 1960 года ў сувязі са скасаваннем Юрацішкаўскага раёна (вёска Трабы ўваходзіла ў яго склад) Маладзечынскай вобласці яго тэрыторыя ўвайшла ў склад Іўеўскага раёна. Так Трабы апынуліся ў новым раёне, і ўжо 60 год прайшло з таго часу. [2. С. 254]

Тэма работы  выбрана мною не выпадкова. Я хачу, каб іншыя ведалі, якую лепту ўнеслі нашы трабчане ў развіццё Іўескага раёна, каб разам са мной даведаліся пра тых апантаных кіраўнікоў, настаўнікаў, урачоў і іншых, хто жыў, працаваў у той адрэзак часу і працягвае ствараць гісторыю слаўнай вёскі Трабы.

Асноўная праблема, з якой я сутыкнулася – гэта недахоп матэрыялаў, звестак па дадзенаму перыяду вёскі Трабы.

Гіпотэза: даследуючы падзеі ў адрэзку 60 гадоў я змагу знайсці адказы на ўсе мае пытанні і папоўніць праўдзівымі фактамі гісторыю вёскі, змагу ўзнавіць незаслужана забытыя імёны, пашырыць цікавасць да культуры і гісторыі сваёй малой Радзімы, а таксама патлумачыць іншым,  што асаблівасці пэўнай мясцовасці могуць проста знікнуць, калі знікне памяць пра іх.

Задачы:

- узнавіць незаслужана забытыя імёны даследуемага мной перыяду;
- даследваць дакладнасць падзей таго часу;
- вызначыць ролю дзейнасці арганізацый у развіцці вёскі;

Метады даследчай работы:

- тэарэтычны (вывучэнне літаратурных крыніц);

- метад апытвання (гутаркі з аднавяскоўцамі і кіраўнікамі арганізацый);

- метад вывучэння дакументаў (архіўныя звесткі).

**ДУХОЎНЫЯ ТРАДЫЦЫІ ТРАБАЎ**

Самы счаслівы чалавек той, хто захоўвае духоўныя традыцыі. Трабчане з'яўляюцца такімі, бо ў згодзе між сабой жывуць вернікі, католікаў і праваслаўных тут пражывае прыблізна пароўну. У самым цэнтры вёскі знаходзяцца дзве святыні: царква Святых апосталаў Пятра і Паўла і касцёл Раства Найсвяцейшай Панны Марыі. Хачу расказаць, як і хто служыў на чале святыняў у 60-гадовы перыяд.

Пабудавана царква ў 1784 годзе з дрэва. У канцы XIX-пачатку XX стагоддзя перад галоўным фасадам па падоўжанай восі царквы пабудавана двух'ярусная зрубная брама-званіца. Трабская царква Святых апосталаў Пятра і Паўла з'яўляецца помнікам драўлянага дойлідства. [3. С.23]

У 1960 - 1970 гадах у Трабскі храм на службу прыязджаў гальшанскі настаяцель пратаіерэй Пётр. З 1990 г. службу нёс пратаіерэй Канстанцін Міхайлавіч Макрыцкі. У Трабах жыла і яго сям'я. З болем і жалем развітваліся з ім жыхары ў 2009 годзе. Вернікі да сённяшняга дня з любоўю і цеплынёй адзываюцца пра айца Канстанціна. [3. С.23]

Настаяцель прыхода іерэй Аляксандр Дзянішчыц, як дбайны гаспадар, захоўвае і аздабляе будынак царквы. Упершыню за час свайго існавання, у царкве быў абноўлены фасад і на самім будынку і на званіцы. Узнесены над дахам новыя пазалочаныя купалы. Айцец Аляксандр, не пакладаючы рук, завіхаецца штодзённа на рыштаваннях. Храм ажыў, маладзее на вачах. І хто зараз можа сказаць, што гэты храм, гэты будынак стаіць у Трабах не адно стагоддзе. [10. С.13]

Касцёл Раства Багародзіцы пабудаваны ў пачатку XX стагодзя з цэглы, на месцы драўлянага касцёла. Ён помнік архітэктуры неаготыкі. Заснаваў касцёл Павел Сухоцкі, партрэт якога упрыгожвае сцены святыні. [3. С.24]

Пасля вайны да 1966 года трабскім святаром быў ксёндз Альфонс Радкевіч. Ён як мог утрымліваў касцёл, а ўлады рабілі ўсё, каб яго выгнаць, і ўрэшце ксёндз быў вымушаны з'ехаць у Польшчу. Да 1971 года Трабы не мелі сталага святара. І тым не менш касцёл працаваў дзякуючы парафіянам, якія яго абаранялі. На працягу трох год з ініцыятывы жыхара Траб Яцкевіча, парафіяне самі збіралі грошы і плацілі налогі, як за дзеючы касцёл. Хоць парафія засталася без ксяндза, то людзі самі маліліся ў святыні і адпраўлялі набажэнствы без святара, спадзяючыся на лепшае і стараючыся атрымаць ад улады дазвол для святара. Таксама тыя ж улады забралі ключы ад касцёла, але гэта не прымусіла жыхароў Траб адрачыся ад веры. Парафіяне пачалі абыходзіць Крыжовую Дарогу вакол касцёла, прычым збіралася столькі людзей, што іх спеў чуўся аж за два кіламетры. Ноччу вернікі таксама не спалі: сцераглі касцёл ад разбурэння.

З цягам часу дазвол быў выдадзены. Вернікі дабіліся таксама, каб прыязджалі ў касцёл ксяндзы з іншых мясцовасцяў. У 1971-1973 гадах у Трабы прыязджаў ксёндз Станіслаў Казлоўскі з Барунаў, затым да 1983 года

ксёндз Уладыслаў Чарняўскі з Вішнева. Першым пастаянным святаром з часоў ксяндза Радкевіча стаў Антоній Юсель, які паходзіў з Трабскай парафіі і прапрацаваў з 1988 г. па 1991 г. З 1991 г. па 1995 г. служыў добра вядомы ў раёне і служыць цяпер у г. Іўя святар  Ян Гавецкі. З 1995 г. па 2004 службу нёс ксёндз  Тадэвуш Качан. А з восені 2004 года, святаром з'яўляецца ксёндз Віктар Субель, які паходзіць з Астраўца. [7. С.9]

17 ліпеня 2005 года касцёл адзначыў сваё 100 – годдзе.  На святкаванне быў запрошаны і Гродзенскі ардынарыюш біскуп Аляксандр Кашкевіч. Біскуп нагадаў пра прыгожы каталіцкі звычай, які быў калісьці на Трабскай зямлі. Калі ў мястэчку ці ваколіцы згараў дом, то збіралі ахвяры з усіх парафіянаў на новы будынак для пагарэльцаў. [9. С.40]

## АДУКАЦЫЙНА-КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ

У школе праходзяць самыя цікавыя і запамінальныя гады дзяцінства, тут чэрпаюць глыбокія веды, патрэбныя кожнаму чалавеку.

У пачатку 60-х гадоў колькасць вучняў у школе расла з кожным годам. Нават заняткі ў дзве змены не маглі выратаваць сітуацыю. Узнікла неабходнасць у пабудаванні новай сучаснай школы. У 1963 годзе было распачата будаўніцтва новай двухпавярховай школы. А ў 1964 годзе школа гасцінна расчыніла свае дзверы для навучэнцаў. На адкрыцці школы прысутнічаў першы настаўнік Іванкевіч Міхаіл Данілавіч.

У 1968 годзе ў школе быў створаны духавы аркестр, яго стварыла і кіравала настаўніца матэматыкі Мігліцкая Людміла Ільінічна. [6. С.13]

Раскажу хто і калі быў дырэктарам школы: 1966-1969гг. – Мікалай Аляксандравіч  Ганчарык, 1972-1977гг. - Іван Нікадзімавіч Чакавы, 1977-1983гг. – Вікенцій Адамавіч Дабраловіч, 1983-1986гг. – Леанід Цімафеевіч Астрэйка, 1986-2000 гг. – Уладзіслаў Іосіфавіч Урбанайць, 2000-2005гг. -  Валер'ян Вацлававіч Пляхімовіч, 2005-2014гг. - Валянціна Мечыславаўна  Марусава, з 2014 года і па цяперашні час кіруе дружным школьным калектывам Пляхімовіч Валер'ян Вацлававіч. [8. С.10]

Трабская сярэдняя школа крочыць у нагу з усёй краінай. У 2005-2008 годзе на базе школы быў рэалізаваны сацыяльна-педагагічны праект "Этнашкола "Панямонне", адкрыты клас з фальклорна – тэатральным накірункам. Дзякуючы чаму ў 2006 г. вучаніца Трабскай школы Ганна Супрановіч стала пераможцам спачатку ў раённым дзіцячым конкурсе "Сузор'е надзей", а потым у Лідзе перамагла і дабралася да сталіцы. На сталічнай сцэне атрымала 25 балаў, што азначала – перамога. Атрымала Дыплом пераможцы рэспубліканскага конкурсу "Сузор'е надзей". Таксама Ганна была пераможцай яшчэ і ў рэспубліканскім конкурсе "Юныя таленты Беларусі". [9. С.60]

Дзейнічае прышкольны гістарычны музей "Скарбніца роднага краю".

Гісторыя школы не заканчваецца…Яна доўжыцца ў кожным са сваіх вучняў і настаўнікаў. Кажуць, што школа славіцца сваімі выпускнікамі. Ёсць кім ганарыцца і Трабскай школе. За сваю шматгадовую дзейнасць школа выпусціла ў вялікае жыццё шмат выдатных выпускнікоў. Былыя выпускнікі школы займаюць бадай усе магчымыя пасады. Са сцен Трабскай школы

выйшлі вядомыя палітычныя дзеячы нашай краіны: Чагіна Елізавета Пятроўна і Дуніч Мікалай Уладзіміравіч.

Працаваў да 2018 года ў Трабах дзіцячы садок "Купалінка", дзе малышоў выхоўвалі ў нацыянальным духу, на лепшых беларускіх і мясцовых традыцыях. Пакоі садка былі афармлены ў беларускім нацыянальным стылі. Ладзіліся з дзецьмі беларускія народныя святы і абрады. Але я хачу расказаць, як пачаў працаваць дзіцячы садок "Купалінка". Калгас "Трабы" ў 1962 годзе пабудаваў першы дзіцячы сад у Іўеўскім раёне. А гісторыя была такая, што ў той час дэкрэтныя водпускі складалі ўсяго некалькі месяцаў. Трэба было ісці на работу, а маленькія дзеці патрабавалі ўвагі. Спачатку людзі баяліся аддаваць дзяцей у сад, першых дзяцей было 8, а праз некаторых час было ўжо 40. Яслі дзейнічалі асобна, туды прыносілі немаўлятак з 6 месяцаў. Першай загадчыцай была Валянціна Сцяпанаўна Янчурэвіч, выхавацелем – Таццяна Антонаўна Елізавецкая, медсястрой – Яніна Іосіфаўна Слабко, заўхозам і бухгалтарам – Ядзвіга Людвікаўна Пятроўская, прачкай – Ірына Антонаўна Лаўрыновіч, нянямі – Марыя Калістратаўна Капачэўская і Марыя Іосіфаўна Субач, повар – Кацярына Васільеўна Ярмохіна, пасудамойка – Алена Пятроўская. Загадчыкамі сада былі: 1963-1976г. – А.Ф. Скрабіна, 1976-1978г. – П.М. Казойць, 1978-1980г. – Э.М. Леанард, 1980-1988г. – Р.І. Чэкавая, 1988-2018 г. – Я.Я. Абражэвіч.

З верасня 2018 года дзіцячы сад далучаны да сярэдняй школы, установа пераарганізавана ў навучальна-педагагічны комплекс. Цяпер работу ясляў-сада курыруе Ганна Аляксандраўна Падгайская. [5. С.1-8]

Кожны дом у нашай вёсцы мае сваю гісторыю. Трабскі дом культуры з 1946 па 2018г. знаходзіўся ў доме, які быў пабудаваны ў 1936г. братамі-яўрэямі Янкелем і Гуткам Рымарамі. Таксама у гэтым будынку размяшчаліся з 1956 па 1963г. аўтамабільны клас і школьная майстэрня Трабскай школы. У 1964 годзе адкрылася новая школа і клас з майстэрняй перабраліся ў новы будынак. А ў 1964 годзе суседкай з клубам стала бібліятэка і па сёняшні дзень яны працуюць у адным будынку. Адразу бібліятэка размяшчалася ў адным пакоі, а з 1973 года ў двух. [4. С.8]

Работнікі культуры – творчыя і таленавітыя асобы. Яны робяць жыццё аднавяскоўцаў больш цікавым і насычаным. У клубнай установе дырэктарам доўгі час працавала С. Н. Кандраценка. Змяніў яе малады і творчы Мікалай Пятровіч Завадскі (1980-2008), пры якім абнавілася тэатральнае жыццё вёскі. У 80-е гады адбылася значная падзея, калектыў Трабскага дома культуры пад кіраўніцтвам М. Завадскага з "Вячоркамі" пабывалі на цэнтральным тэлебачанні Беларусі. Мікалай Пятровіч цяпер плённа працуе ў Іўеўскім цэнтру культуры і адпачынку. У 2003 годзе ў клуб на працу прыйшоў таленавіты рэжысёр Міхаіл Станіслававіч Калышка, які стварыў драматычны калектыў. Праз чатыры гады гэты калектыў атрымаў званне народнага. Шмат цікавых спектакляў паставіў калектыў, які і цяпер заварожвае сваімі пастаноўкамі, як трабчан так і жыхароў раёна. З 2008г. па 2016г. дырэктарам аддзела культурна-масавай і асветніцкай работы была Марына Тадэушаўна

Танкевіч. Цяпер на кіраўнічай пасадзе - Міхаіл Станіслававіч Калышка. [9. С.32]

Адно з самых наведвальных мейсц трабчанамі - бібліятэка. Тут заўсёды працавалі прыветлівыя, уважлівыя, зычлівыя прафесіяналы сваёй справы. З 1956г. па 1963г. - бібліятэкар Белакоз Валянціна Нікіфараўна, 1963-1966гг. - бібліятэкар Багданчык Марыя Іосіфаўна, 1966-1971гг. - бібліятэкар Ясінская Зоя, 1971 – 1975гг. - бібліятэкар Снытко Галіна Васільеўна, у 1975 годзе бібліятэку прыняла бібліятэкар Аляшкевіч Ніна Аляксандраўна. З 1986 па 2013г. ў бібліятэцы працуе два чалавека. З 1986г. па 2013г. бібліятэкарам чытальнай залы стала Багушэвіч Ліля Уладзіміраўна. З 2014г. і па сённяшні дзень бібліятэкарам працуе Макуцэвіч Святлана Генрыхаўна. [4. С.6-8] Святлана Генрыхаўна цесна супрацоўнічае са школай, дзіцячым садком, сельскім саветам і іншымі вясковымі ўстановамі. Пры бібліятэцы актыўна дзейнічае жаночае аматарскае аб'яднанне "Бяседа". За год бібліятэкай праводзіцца больш за 30 цікавых масавых мерапрыемстваў.

**СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА**

У сакавіку 1960 года на базе трох калгасаў: "За мір", "Імя Чапаева", "Звязда" быў арганізаваны саўгас "Трабы". Праз год, у сакавіку месяцы 1961 года саўгас быў раздзелены на два саўгасы: "Чарнэлі" і "Трабы". Дырэктарам саўгаса з 1961 па 1964 год працуе Лазуткін Мікалай Пятровіч, з 1964 па 1975 год дырэктар – Слабко Пётр Міхайлавіч, з 1975 па 1986 год кіруе саўгасам Марцулевіч Тадэуш Аляксандравіч, з 1986 па 1995 год кіраўніцтва прымае Дуніч Мікалай Уладзіміравіч. [4. С.10] Менавіта на гэтыя гады прыйшоўся найбольшы росквіт Трабаў, рост эканамічнага і сацыяльнага развіцця гаспадаркі. Шырока вялося будаўніцтва жылля, ствараліся жыллёва-будаўнічыя кааператывы, быў пабудаваны фізкультурна-аздараўленчы комплекс, першы ў раёне, падняўся сацыяльны статус вёскі. Старшыня сам працаваў без стомы і патрабаваў гэта ад іншых. [9. С.30] У 1987 годзе саўгас "Трабы" пераўтвараецца ў калгас "Трабы", а 30 снежня 1991 года ў калас-аграфірму "Трабы". Са студзеня 1995 года калгасам пачаў кіраваць Васілеўскі Іван Іванавіч і па сёняшні дзень паспяхова гэта робіць. Іван Іванавіч Васілеўскі аказаўся дбайным гаспадаром. За час яго дзейнасці ў Трабах выраслі цэлыя вуліцы новых прыгожых жылых дамоў, пабудаваны новы сучасны зернасушыльны комплекс, абноўлены будынак праўлення СВК. Наш калгас спецыялізуецца на вытворчасці малака і мяса, адкорме буйна-рагатай жывёлы, вырошчванні лёну, зернавых і зернабабовых. [5. С.14]

Якім бы ні быў час, людзі на сяле заўсёды працуюць шчыра і аддана, усе працаўнікі вёскі робяць адну вялікую справу: не даюць страціць зямлі ўрадлівасць, знямець вёсцы. Працаўнікі саўгаса неаднаразова станавіліся пераможцамі ў сацыялістычных спаборніцтвах перадавікоў сельскіх гаспадарак не толькі ў раёне, а нават у рэспубліцы.

## ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЎСТАНОВЫ МЯСТЭЧКА

Амаль усе кіраўнікі ўстаноў і арганізацый, размешчаных на тэрыторыі сельсавета, — свае, мясцовыя. Моладзь нярэдка пасля атрымання вышэйшай ці сярэдняй спецыяльнай адукацыі вяртаецца дадому, у родную вёску.

У 2007 годдзе вёска Трабы набыла новы статус аграгарадка. І сапраўды, кругом чысціня і парадак, радуюць вока абноўленыя будынкі. Абноўлены будынак сельскага выканаўчага камітэта размясціўся ў самым цэнтры Трабаў.

Са слоў старшыні сельсавета Валянціны Мечыславаўны, што працуе ў органе ўлады – гэта паўсядзённая работа з людзьмі. Прыходзіцца ўнікаць не столькі ў вытворчыя справы, колькі вырашаць жыцейскія праблемы. Старшыні сельскага савета: 1960-1967г. – Савіцкі Станіслаў Станіслававіч, 1975-1995г. – Слабко Пётр Міхайлавіч, 1995-1998г. – Канойка Валерый Сцяпанавіч, 2000-2013г. - Гурын Аляксандр Канстанцінавіч, 2014г. і па цяперашні час - Марусава Валянціна Мечыславаўна. [1.]

Трабская бальніца заўсёды была аб'ектамгонару мясцовага калгаса і калектыва трабскіх медыкаў. Тут заўсёды працавалі дабразычлівыя прафесіяналы. З 1957 года доўгі час фельдчарам бальніцы працаваў Смушка Віктар Ігнацьевіч. Масюкевіч Зінаіда Іосіфаўна з 1956 года пачала працаваць патранажнай медсястрой, потым добрасумленна працавала старэйшай медсястрой. У 1993 годзе пайшла на пенсію, але яшчэ доўгі час заставалася верная сваёй прафесіі. Ілюковіч Браніслава Казіміраўна працавала ў бальніцы з 1958 па 1990 год. З 1948 па 1981 год медыцынскай сястрой працавала Хадарцэвіч Таццяна Андрэеўна. Багдановіч Вера Пятроўна медсятра з 1956 па 2019 год. Апантанымі у сваёй рабоце была сямейная пара ўрачоў Дзяругіных – Аўрора Аляксандраўна і Мікалай Канстанцінавіч. З 1971 па 1985 год таксама працавала сямейная пара ўрачоў Курленковых – Вікторыя Антонаўна і Барыс Георгіевіч, а потым пераехалі ў г. Іўя. Санітарным фельчарам нашай бальніцы з 1968 года плённа працавала Гурын Леакадзія Паўлаўна. Фралова Ніна Аляксандраўна пачала працаваць з 1972 года медсястрой, а потым загадчыкам фізкабінета. У лістападзе 2007 года бальніца рэарганізавана на Трабскую амбулаторыю і Трабскую бальніцу сястрынскага догляду. Тут жа ў будынку бальніцы месціцца і аптэка у якой з 1953 па 1993 год загадчыкам працавала Савіч Надзея Васільеўна. [5. С. 10-13]

Задаволены новым, больш прасторным і сучасна аформленым памяшканнем паштавікі. З 2008 года начальнікам паштовага аддзялення
аг. Трабы працуе Алена Іванаўна Тарасевіч. Перыядычныя выданні дастаўляюцца насельніцтву ў час.

У канцы 2007 года адкрыўся філіял “Беларусбанка” для зручнасці насельніцтва, а таксама для таго, каб крыху разгрузіць работнікаў пошты. Тут светла, цёпла і камфортна як кліентам, так і тым, хто працуе.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

У ходзе праведзенага даследавання я дасягнула пастаўленай мэты. Я знайшла адказы на ўсе свае пытанні: даведалася калі Трабы ўвайшлі ў склад Іўеўскага раёна, як тады працавалі розныя арганізацыі, што змянілася за гэты адрэзак часу, і знайшла яшчэ шмат цікавай, карыснай, патрэбнай інфармацыі.

Я ганаруся сваім аднавяскоўцамі, якія займаюцца непрыкметнымі, будзёнымі, але надзвычай важнымі і патрэбнымі справамі: вырошчваюць хлеб, даглядаюць жывёлу, клапоцяцца пра нашу адукаванасць, здароўе, спакой і цішыню. Я больш даведалася пра вядомых і паважаных людзей аг. Трабы.

Лічу, што вынікі дадзенага даследвання маюць вялікую практычную значнасць:

- магчымасць выкарыстання сабранага і сістэматызаванага матэрыялу для правядзення ўрокаў гісторыі і грамадазнаўства;
- магчымасць выкарыстоўваць сабраны матэрыял для выхаваўчых мерапрыемстваў.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Архіў сельскага савета. - 1960-1980г.
2. Врублеўскі, В. Гісторыя школы і анамастыка.- Мінск: Галіяфы, 2011.-264с.
3. Летапіс вёскі Трабы: Падарожжа ў мінулае в. Трабы. Т.1.– Бібліятэка-філіял аг. Трабы. - 1997г.
4. Летапіс вёскі Трабы: Жыццё вёскі. Т.2.– Бібліятэка-філіял аг. Трабы. - 1997г
5. Летапіс вёскі Трабы: Хроніка падзей. Т.3.– Бібліятэка-філіял аг. Трабы. - 1997г.
6. Летапіс Трабскай сярэдняй школы, 1990.
7. Сцефаноўская, Я. Каталіцкі касцёл у Трабах на пераломных этапах гісторыі: Даследчая работа Трабскай СШ. - 2013г.
8. Сцефаноўская, Я. Калышка, К. Этапы станаўлення адукацыі ў Трабах: Даследчая работа Трабскай СШ. - 2015г.
9. Трабы на старонках газеты // Папка газетных артыкулаў (1997-2010г.) – Бібліятэка-філіял аг. Трабы.
10. Трабы на старонках газеты // Папка газетных артыкулаў (2010-2018г.) – Бібліятэка-філіял аг. Трабы.